# Крыж

***Сяржук Сокалаў-Воюш***

*Крыж. Ярылаў Крыж* на шчыце Пагоні. *Крыж* нябеснай заступніцы Беларусі сьвятой Эўфрасіньні... Усё гэта — неадменныя сымбалі Бацькаўшчыны, як неадменныя праявы нашага жыцьця — *крыжмы* — кавалкі тканіны, на якія клалі дзіця пасьля *кшчэньня, крыжавыя* слупы й раздарожжы, танец *крыжачок* і *крыжыкі* — форма ўкладкі снапоў пры сушцы ў полі ці гатунак вышыўкі, а ўзор *Крыжа* на той самай вышыўцы, залежна ад формы — і знак агню нябеснага ці падземнага, і сымбаль сустрэчы закаханых ды пачацьця, і выява сямейнага агменю, і, урэшце — сьмерці.

*Крыжакі* — нямецкія рыцары — частка нашае гісторыі, а *крыжак* і *крыжовік* — гэта таксама старадаўнія манэты з выявай *крыжа.* А да гэтага — *Крыж ордэну Пагоні* і *Крыж Зялезнага рыцара* — узнагароды Беларускай Народнай Рэспублікі. *Крыж Булак-Балаховіча* — беларускі ордэн, які выдаваўся беспасярэдна ў часе баявых дзеяньняў.

Яшчэ адно значэньне: *крыж,* альбо *крыжавіна,* — частка нашага цела.

*Скрыжаваць* мячы, *скрыжаваць* позіркі, *несьці свой крыж* і *паставіць крыж* на чым-небудзь.

У іншых славянскіх мовах слова *Крыж* гучыць падобна да беларускага. Найдалей ад нашага хіба ніжнелужыцкае — *ksica* і расейскае *крест*. Але ўсе яны, як і ангельскае *cross* і французскае *croix,* маюць тое самае паходжаньне.

Культурны чалавек, прыехаўшы на Беласточчыну, ніколі не абміне Грабаркі. Так называецца найбольш шанаваная тамтэйшымі беларусамі царква, вакол якой сотні, калі ня тысячы *крыжоў*. Пастаўленыя рукамі вернікаў, яны — сымбаль звароту да Бога, знак чалавечае просьбы дапамагчы ў бядзе. Пра нешта падобнае кажа Зянон Пазьняк, калі прапаноўвае ўсім беларусам сьвету прынесьці са сваіх мясьцінаў свой *крыж* на Курапаты і гэткім чынам стварыць агульнанародны, агульнанацыянальны помнік нашай памяці, цеплыні нашых сэрцаў і нашай лучнасьці з Богам.

# Крыжаванка

***Ян Максімюк***

*Крыжаванка* належыць да тых унікальных словаў у беларускай мове, чыё публічнае зьяўленьне ў сьвеце можна вызначыць з дакладнасьцю да аднаго дня. Упершыню яно зьявілася ў беластоцкай „Ніве“ пад датай 8 студзеня 1989 году. У тым нумары беластоцкі беларускі тыднёвік на апошняй старонцы зьмясьціў гульню-задачу, у якой „фігуру зь перакрыжаванымі радамі клетак патрэбна запоўніць літарамі, так каб па вэртыкалях і гарызанталях атрымаліся пэўныя словы“ (паводле тлумачальнага слоўніка) з назвай *крыжаванка*. Кажучы па-ранейшаму — красворд. Дата мне помніцца, бо аўтарам як той гульні-задачы, так і ейнага назову быў я сам. Ужо тады „гарызанталі“ і „вэртыкалі“ мне былі не даспадобы, і ў сваёй *крыжаванцы* я заступіў іх словамі „ўпоперак“ і „ўніз“ адпаведна.